**Пазакласнае чытанне** «Зімовы дзянёк, што камароў насок»( 3 клас) 15.01

Мэты: Арганізаваць чытанне і разгляд кніг пра прыгажосць зімы, пра забавы і адпачынак дзяцей у гэтую пару года, пра захаванне нацыянальных традыцый і святкаванне зімовых свят. Удасканальваць навык правільнага вымаўлення гукаў і захоўваць акцэнталагічныя нормы пры чытанні. Узбагачаць слоўнікавы запас вучняў лексікай твораў. Фарміраваць правільнае, асэнсаванае, беглае і выразнае чытанне твораў цэлымі словамі.

**Папярэдняе заданне**: А.Вольскі “Зімовае сонца”, М.Маляўка “Белы верблюд” (падрыхтаваць малюнак на выбар), У.Ягоўдзік “Каляды”, Я.Колас “На рэчцы зімою”,Г.Аўласенка “Хто як зімуе”.

**Тып**: урок-падарожжа

**Ход урока.**

**1.Арганізацыйны момант.**

**2.Уступная гутарка.**

- Паглядзіце на малюнкі
- Якая пара года на іх адлюстравана? Якая тэма нашага ўрока?

Гутарка пра зіму.

- Зімой прырода змяняе свае прыкметы. Сонца хаваецца за хмары, настае час пахмурнага неба і ранняга змроку. Дзень становіцца карацейшы, а ноч даўжэйшай. Уцёмны час сутак вы павінны абазначыць сябе святловяртаючымі элементамі. Помніць пра правілы паводзін на дарогах зімой.
- Сёння адправімся ў невялікае падарожжа па старонках прачытаных твораў.

**3.Праца па тэме.**

** Першы прыпынак “Мастацкая галерэя”*

Прачытайце прыкметы пра зіму (на дошцы).

1 Ранішняя снежная зара хутка гасне – на холад, а калі чырванее – чакай снегападу.
2. Барвова – чырвоная снежаньская вячэрняя зара – да мяцеліцы.
3. Вераб’і дружна зацырыкалі, вароны з дрэва на дрэва чародамі пералятаюць – да адлігі.
4. Чырвонымі ягадамі рабіна красуе – да марознай снежнай зімы.
5. Месяц свеціць ярка – чакай яснага, марознага дня.

- Якія з гэтых прыкмет можна аднесці да верша А.Вольскага “Зімовае сонца”?
- Чытанне верша ўслых.
- Разгядванне выставы малюнкаў да верша, падрыхтаваных вучнямі.
- Суаднясенне малюнкаў з урыўкаім верша.

** Другі прпынак “Цудоўныя святы”.*

- Чытанне апавядання У.Ягоўдзіка “Каляды”
- Франтальнае апытванне
    - ✔ Ад якіх слоў утварылася слова “каляды”?
    - ✔ На што падобен год?
    - ✔ Што такое куцця?
    - ✔ Што нельга было есці на першую куццю?
    - ✔ Для чаго гаспадыня пасыпал стол жытам?
    - ✔ Каму пакідалі астаткі куцці і іншай стравы?

** Трэці прыпынак “Зімовыя забавы”*

- Чытанне верша Я.Коласа “На рэчцы зімою”.
- Якія яшчэ зімовыя забавы вы ведаеце? Адгадванне загадак.

Улетку адпачываюць,
А ўзімку дзяцей катаюць.
*(Санкі)*

Па сцяжыне, па дарозе
Бегчы я ў іх не ў змозе
Іпа снезе не ідуць,
Лёд убачаць – і лятуць!
*(Канькі)*

Вырасла са снегу
Дзецям на пацеху.
Дзівіцца Мароз –
З морквы ў яе нос.
*(Снежная Баба)*

Прыйшла баба з вятрамі,
З белымі снягамі.
Прывяла з сабою
Дзеда з барадою.
*(Зіма і Дзед Мароз)*

Шар пастаўлены на шар,
Нос чырвоны на ўвесь твар,
Рот і вочы – вугалькі.
Адгадайце, хто такі?
*(Снегавік)*

- Паўтарэнне правіл бяспечных паводзін зімой.

** Чацвёрты прыпынак “Зімовы лес”*

- Чытанне казкі Г.Аўласенка “Хто як зімуе” настаўнікам
- Знаходжанне і выпраўленне памылак у казцы.
** Пяты прыпынак “Зімовыя фантазіі”*
- Чытанне верша М.Маляўкі “Белы вярблюд”
- Гутарка па малюнках-фантазіях вучняў.
** Канцавы прпынак: відэа-рэлаксацыя.*
https://www.youtube.com/watch?time_continue=4&v=jEbdBvYNJOs
**4. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія.**
- Што зацікавіла вас на ўроку?
- Гульня “Зіма – гэта добра ці дрэнна?”
Хлопчыкі адказваюць на пытанне: Чаму зіма – гэта дрэнна?
Дзяўчынкі: “чаму зіма – гэта добра”
**5.Дамашняе заданне.**
Папярэдняе заданне да наступнага ўрока пазакласнага чытання “Як ты да людзей, так і людзі да цябе”